Спадчына

# Нарыс паўстання

**7 кастрычніка ў Гродненскай абласной навуковай бібліятэцы ім. Карскага прэзентавалі кнігу пра паўстанне 1863-1864 гадоў у Беларусі.**

У гэтым годзе адзначаецца 150-годдзе паўстання пад кіраўнцтвам К. Каліноўскага. Праца Дзмітрыя Матвейчыка «Паўстанне 1863-1864 гадоў у Беларусі: нарыс баявых дзеянняў» — гэта 120 старонак, на якіх у навукова-папулярнай форме апісваюцца фарміраванне паўстанцкіх арганізацый, баявыя дзеянні паўстанцкіх атрадаў і рэпрэсіі супраць яго ўдзельнікаў. У сваёй кнізе гісторык асноўную ўвагу звяртае на вайсковы аспект падзеяў і закранае амаль не даследаваныя іх бакі. Дзмітрый Матвейчык адзначыў, што пісаць навукова-папулярную кнігу складаней за навуковую. Вялікая ўвага была нададзена пошуку і падбору ілюстрацый. Нарыс баявых дзеянняў, пры пэўнай вузкаспецыяльнай скіраванасці, прызначаны для шырокага кола чытачоў. Гэта чарговае выданне вайскова-гістарычнай серыі «Беларусь у войнах».

**Наталля ПАЎЛЮКЕВІЧ.**